УДК 811.161.3’373.21

# ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ ТЫПЫ ГІДРОНІМАЎ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

**Шубадзёрава Ала Міхайлаўна**
дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

Асобае месца сярод геаграфічных назваў займаюць назвы водных аб’ектаў: рэк, балот, азёр, сажалак, крыніц, малых рэчак і ручаёў і інш. Сукупнасць назваў такога тыпу складаюць гідраніміку. Гідранімічны матэрыял любога населенага пункта выклікае цікавасць для навуковага даследавання, паколькі гэты пласт лексікі захоўвае багатую інфармацыю пра гісторыю гэтай мясцовасці, яе культуру, і разам з тым, што вельмі важна, – пра беларускую мову.

Аб’ектам нашага назірання сталі гідронімы, зафіксаваныя ў “Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны” [1]. Сярод гідрааб’ектаў дадзенай тэрыторыі (як існуючых, так і зніклых) можна вылучыць чатыры групы: гелонімы (балоты і забалочаная мясцовасць), лімнонімы (азёры і копанкі), патамонімы (рэкі), мікрагідронімы (ручаі, крыніцы, сажалкі, каналы, канавы і інш.). У складзе гідраніміі Магілёўшчыны дамінуюць славянскія паволе паходжання назвы з даволі празрыстай матывацыяй.

У якасці ўтваральных асноў уласных назваў гідронімаў выкарыстоўваюцца апелятывы і онімы. У сувязі з гэтым можна вылучыць дзве лексіка-семантычныя групы гідронімаў: 1) гідронімы адапелятыўнага паходжання і 2) гідронімы аданамастычнага паходжання. Для размежавання семантычнага аб’ёму гідронімаў вышэйназваных груп выкарыстоўваліся значэнні ўтваральнай асновы і функцыі гідрафарманта, якія звычайна выступаюць у адзінстве.

**Гідронімы адапелятыўнага паходжання.** Вялікую групу такіх гідронімаў складаюць назвы, утвораныя ад апелятываў, якія характарызуюць сам водны аб’ект па розных прыметах:

а) форме (*ШЫР**О**КАЕ В**О**ЗЕРА, КРЫВ**О**Е, КРЫВ**А**Я Л**У**ЖА, КР**У**ГЛЕНЬКАЕ БАЛ**О**ТЦА, Д**О**ЎГАЕ БАЛ**О**ТА;* АВ**Е**ЧЫ КАПЫТ**О**К, ШТАН**Ы**, АНДРЭЕВЫ ШТАН**Ы**, Ш**А**ПКІ, ПАДК**О**ВА, ТАЛ**Е**РКА, *ЖАБІНАЕ В**О**КА, ГР**Ы**ВА* – нагадваюць адпаведныя прадметы);

б) памеры (ВЯЛ**І**КАЕ ПАТАП**Е**ЧЧА, ВЯЛ**І**КАЕ БАЛ**О**ТА, БАЛЬШ**О**Е БАЛ**О**ТА, БАЛЬШ**А**Я ЗАТ**О**КА, БЯЗД**О**ННЫ, БЯЗД**О**ННІЦА);

в) стану паверхні (КАРЧАВ**О**Е БАЛ**О**ТА, КАРЧ**Ы**, КАЛАДЗЯН**О**Е БАЛ**О**ТА – праз яго калісьці была вымашчана калодамі сцежка, КУПЯВ**І**ЦА –

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

куп'істае балота, МАХНАТАЕ БАЛ**О**ТА – на ім растуць "белыя махнатыя кветачкі" (паводле жыхароў), М**О**ХАВА БАЛ**О**ТА – парослае мохам, Г**О**ЛАЕ БАЛ**О**ТА – на ім нічога не расце);

г) ступені забалочанасці (БАГН**О,** ГР**А**ЗНАЕ БАЛ**О**ТА, ГРАЗ**І**ВЕЦ, НЯЧ**Ы**СТАЕ, ТАП**І**ЛЫ, ТАП**І**НА, В**Я**ЗКАЕ, ГН**І**ЛІШЧА).

У адапелятыўных утварэннях характарызуюцца назвы, звязаныя з прыродна-геаграфічнымі ўмовамі мясцовасці, у якой знаходзіўся або знаходзіцца водны аб'ект. На Магілёўшчыне шырока прадстаўлены гідронімы, у аснову якіх пакладзены апелятывы, што характарызуюць уласцівасці навакольнага грунту: торф, пясок, гліна, каменне (ТАРФ**Я**НКА, ТАРФ**Я**НІШЧА, ТАРФ**Я**НІЦА, ТАРФ**Я**НІК, ТАРФ**Я**НАЕ БАЛ**О**ТА, ТАРФ**О**ВІШЧА, ПЯСЧ**А**Н**А**Е БАЛ**О**ТА, ПЯСК**І,** ГЛ**І**НІШЧА, КАМЯН**Е**Ц, КАМ**Е**ННІЦА), назвы рэльефу: узвышаных месц (ВЫС**О**КАЕ БАЛ**О**ТА, КУРГ**А**Н, АСТРАВ**І**НА, АСТРАВ**О**К), нізін (НІЗК**І,** НІЗ**І**НКА).

Пашыраны на даследуемай тэрыторыі гідронімы, у аснову якіх леглі апелятывы, што характарызуюць месцазнаходжанне гідрааб'екта: ЗАПР**У**ДДЗЕ, ЗАЛ**У**ЗЗЕ, ЗАЛ**У**ЖЖА, ЛУГАВ**О**Е В**О**ЗЕРА, ЗАЛ**Е**ССЕ, ЛЯСН**О**Е В**О**ЗЕРА, ЗАВ**О**ЗЕР'Е, ПАДАЛ**Е**ШЫНА – невялікае балота, якое знаходзіцца ў алешніку, ГР**А**ДАЧНАЯ – балота, вакол якога знаходзяцца градкі, БАРАВ**А**Я КРЫН**І**ЦА – крыніца ў бары.

Даволі часта водныя найменні матывуюцца назвамі расліннага свету. Крыніцай для ўтварэння фітафорных гідронімаў сталі назвы дрэў, кустоўя, травяністых раслін. Найбольш прадуктыўныя ва ўтварэнні гідронімаў Магілёўшчыны **назвы дрэў** (асіна, дуб, сасна, бяроза, вярба, ліпа, ясень): САСН**О**ВАЕ БАЛ**О**ТА, БЯР**О**ЗАЎКА, ПЛАК**У**ЧАЯ – крыніца, побач з якой расце ніцая вярба, Л**І**ПАВАЕ БАЛ**О**ТА, ЛАЗОВІЦКАЕ В**О**ЗЕРА, ЛАЗ**А,** ДУБР**О**ВЕНСКАЯ БАЛ**О**ТА, ДУБАВ**О**Е, АС**І**НАВЫ РУЧЭЙ, АС**І**НАВІЦА, АС**І**ННІКІ, **Я**СЕННЯ, **Я**СЕДКА, ЯСЁНА, **назвы раслін** (асака, хвошч, чарот, мох): ПЛЮШЧА**І,** КАМЫШ**Ы**ННІК, АС**О**КІ, АСАК**А,** М**О**ХАНАВА, М**О**ХАЎКА і інш. Назвы садовых і агародных раслін, а таксама ягад і грыбоў для ўтварэння гідронімаў выкарыстоўваюцца значна радзей: ЖУРАВ**І**НІХА, ЖУРАВ**І**НКА, ЖУРАВ**І**НАВАЕ БАЛ**О**ТА, КЛ**Ю**КАЎНЯ – балота, калісьці тут было шмат журавін (руск. клюквы), БАРАВ**І**ШЧА – балота, некалі тут было шмат баравікоў.

Найменні дзікіх і дамашніх жывёл (з перавагай першых) утвараюць заафорныя гідронімы: БАБР**О**ВА Л**О**ГАВА, БЫЧ**Ы**НАЕ БАЛ**О**ТА, В**О**ЎЧАЕ БАЛ**О**ТА, КАЗ**І**НАЕ БАЛ**О**ТА, СВІН**О**Е БАЛ**О**ТА.

Вылучаецца група гідронімаў, у аснову якіх пакладзены апелятывы, што характарызуюць асаблівасці вады ў вадаёме. Яны ў асноўным указваюць на колер вады (Б**Е**ЛЫ РУЧЭЙ, ГАЛУБ**А**Я КРЫН**І**ЦА, Ж**О**ЎТАЕ ТАП**І**ЛА, ЗЯ-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ЛЁНЫ РУЧЭЙ, ЧЫРВ**О**НАЕ В**О**ЗЕРА і інш.), тэмпературу (СЦЮДЗЁНКА, СЦЮДЗЯН**Е**Ц, ХАЛ**О**ДНЫ ВІР, ЛЯД**О**ЎНЯ, ЦЁПЛЕНБКАЕ), гучанне (ГРЫ-М**У**ЧАЯ КРЫН**І**ЦА, БРАЗГ**У**Н).

Абмежаванай колькасцю прадстаўлены гідранімічныя назвы, утвораныя ад апелятываў, якія адлюстроўваюць матэрыяльную і духоўную культуру (МЛЫН**О**К, ПЕНЬКАМ**О**ЧЧА), сацыяльную характарыстыку людзей (П**А**НСКАЕ В**О**ЗЕРА, П**А**НСКАЯ КРЫН**І**ЦА, П**А**НАВА БАЛ**О**ТА, ПАП**О**ВА В**О**ЗЕРА, ПАП**О**ВА БАЛ**О**ТА).

**Гідронімы аданамастычнага паходжання.** Для найменняў анамастычнага паходжання ўтваральнымі асновамі паслужылі: антрапонімы, айконімы, гідронімы, мікратапонімы.

Найбольшую групу складаюць гідронімы, што матывуюцца антрапонімамі (імёны, мянушкі, прозвішчы): АГНЁВА В**О**ЗЕРА, АД**А**МАВА БАЛ**О**ТА, АЛ**Е**НІНА В**О**ЗЕРА, АН**І**СБКАВА БАЛ**О**ТЦА, Б**О**ЛБАТАВА КРЫН**І**ЦА. Імёны кананізаваны ў асноўным з грэчаскай, лацінскай і яўрэйскай моў: Г**А**ННІНА (яўр.) КРЫН**І**ЦА, Г**Е**РМАНАВА (лац.) БАЛ**О**ТА, ГР**Ы**ШАВА (грэч.) СТАЛ**О**ТА, ДАН**І**ЛАВА (яўр.) КУП**А**ЛЬНЯ, ДЗЯМ'**Я**НАВА (грэч.) Л**Я**ДА, ДЗЯН**І**САВА (грэч.) КРЫН**І**ЦА, **Е**ВІНА (яўр.) БАЛ**О**ТА, ІГН**А**ТАВА (лац.) РЭЧКА, ЛЯВ**О**НАВА (грэч.) КРЫН**І**ЦА. Утварэнне гідронімаў ад антрапонімаў тлумачыцца тым, што людзі мелі непасрэднае дачыненне да водных аб'ектаў: асушалі балоты, капалі сажалкі, расчышчалі крыніцы, выкарыстоўвалі для розных гаспадарчых патрэб і інш.

У якасці утваральных асноў адайканімічных гідронімаў часта выступаюць назвы населеных пунктаў, размешчаных звычайна непадалёку ад гідрааб'ектаў: БАРДЗІЛ**О**ЎСКАЕ БАЛ**О**ТА. Балота ў лесе каля в. Бардзілы Чав., ВІЛ**Е**ЙСКАЕ БАЛ**О**ТА. Балота каля в. Вілейка Чав., ВІШ**О**ЎСКАЕ В**О**ЗЕРА. Возера ў в. Вішова Бял., ГАЛ**О**ЎЧЫНСКАЕ БАЛ**О**ТА. Балота каля в. Галоўчын Бял., ДУБРАЎСКАЕ В**О**ЗЕРА. Возера ў в. Дубраўка Маг.

Гідронімы, утвораныя ад іншых гідронімаў (КАМ**А**РЫНА БАЛОТА. Балота. Раней тут працякала р. Камарынка. Калюга Глуск., КВЯЦ**Е**ЙКІНА КРЫН**І**ЦА. Канал. Раней тут была крынічка Квяцея. Фядотава Буда Клім., РЭ**Ч**КІ мн. Балота. Паводле падання, некалі тут працякала рака. Будзішча Бял.;), а таксама мікратапонімаў (ВЫШК**О**ЎСКАЕ БАЛ**О**ТА. Балота ў Вышкоўскім лесе. Перагон Слаўг.) выкарыстоўваюцца рэдка.

Такім чынам, прааналізаваныя гідронімы сведчаць аб тым, што Магілёўшчына мае свае адметныя назвы водных аб'ектаў, розныя паводле семантыкі, якія складаюць самабытны пласт нашай мовы і культуры.

**Літаратура**

1. Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны / С. В. Клімуць [і інш.]; пад агульнай рэд. В. І. Рагаўцова. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2004. – 208 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова